# IX Майскія Віткаўскія чытанні
# “Мая радзіма – Случчына”

Яны выдаліся на год святкавання 105-й гадавіны з дня нараджэння пісьменніка-земляка і 900-гадовага юбілею Слуцка.




*Чытанні адкрываюцца заўсёды ўрачыста*

Кожныя Віткаўскія чытанні маюць свае адметнасці. Знакавая падзея ў жыцці горада прымусіла па новаму паглядзець на гісторыю горада, творчасць ураджэнцаў нашага краю ў якасці аб’екта для літаратурных акцый і асобных мерапрыемстваў. Да ўрачыстай даты быў выпушчаны спецыяльны нумар “Кніжнага праспекта” ў раённай газеце “Слуцкі край”.

Урачыстае адкрыццё на пляцоўцы перад бібліятэкай пачалося на ўзнёслай ноце: гасцей сустракалі пад мелодыі духавога аркестра (кіраўнік Пётр Лазука) Слуцкай дзіцячай школы мастацтваў. Гасцямі і ўдзельнікамі Чытанняў сталі члены рэдкалегіі часопіса “Вясёлка”, калегі з Мінскай сістэмы дзіцячых бібліятэк, пісьменнікі, настаўнікі, бібліятэкары. Прывітальны адрас з пажаданнямі плённай паспяховай



*Чытанні адкрывае начальнік аддзела ідэалагічнай рабовы, культуры і па справах моладзі М.Верабей*



*У Чытаннях на Случчыне штогод прымаюць удзел каля двух тысяч чалавек*

працы ўдзельнікам чытанняў накіраваў старшыня Слуцкага раённага выканаўчага камітэта Андрэй Янчэўскі. У ім гаворыцца, што Віткаўскае свята сабрала пісьменнікаў і журналістаў, настаўнікаў і бібліятэкараў, прыхільнікаў творчасці паэта, усіх тых, хто хоча яшчэ раз сэрцам дакрануцца да ёмкага, сакавітага віткаўскага слова. Віткаўскія чытанні – узор развіцця чытацкай культуры, захавання духоўнай спадчыны, беражлівых адносін да роднай мовы і літаратуры. Мы ўсе зацікаўлены, каб слова такога выдатнага пісьменніка, якім быў Васіль Вітка, хвалявала сэрцы маладых, узбуджала ў іх жаданне жыць па сумленні.




*Сяўзюк Дмітрый ўзнагароджаны Дыпломам III ступені*

Кожныя Віткаўскія чытанні маюць свае адметнасці: на гэты раз іх адкрыў творчы марафон-конкурс чытальнікаў “Жыў на свеце дзед Васіль”. Ён скіраваны на пашырэнне прасторы чытання па-беларуску, увогуле прасторы дзіцячага чытання. Імя і творчасць вялікага беларускага дзіцячага пісьменніка Васіля Віткі – выдатны грунт для такой справы. Творы Васіля Віткі падабаюцца маленькім чытачам, бо лёгка чытаюцца і добра запамінаюцца. А яшчэ іх можна з поспехам абыграць, калі гаворка ідзе пра творчае спаборніцтва.




*Намеснік галоўнага рэдактара часопіса “Вясёлка” А.Радзікевіч віншуе з перамогай Аляксандру Нікіціну*

На дзвюх паэтычных конкурсных пляцоўках выступілі больш за трыццаць школьнікаў са школ горада і раёна. На суд гледачоў і журы былі

прадстаўлены вершы, проза, казкі, пацешкі.

Гледачы атрымалі сапраўдную асалоду ад выканальніцкага майстэрства юных артыстаў і ўдзельнікаў конкурсу чытальнікаў.



*У час конкурса “Жыў на свеце дзед Васіль”*

Прыгожа і ўмела працавалі з творамі Васіля Віткі дзеці і іх кіраўнікі – настаўнікі і бібліятэкары. Школьнікі пераўвасабляліся ў паэтычных герояў, паўставалі перад аўдыторыяй у прыгожых беларускіх касцюмах, а ўжо чыталі так, што і дарослыя дзівіліся, як можна на працягу дваццаці хвілін бездакорна дэкламаваць тэкст, вытрымліваць інтанацыі і быць пры гэтым вельмі артыстычным. Не дзіва, што прызы сімпатый удзельнікам малодшай групы (7 – 10 гадоў) уручыла намеснік дырэктара выдавецкага дома «Вясёлка» Анастасія Радзікевіч. Выклікалі захапленне і чытальнікі, якія выступалі па-за конкурсам. Удзельнікі і пераможцы свята атрымалі Ганаровыя дыпломы.




*Намеснік галоўнага рэдактара часопіса “Вясёлка” А.Радзікевіч з юнай удзельніцай конкурса*

16 мая аматараў паэтычнага слова Случчыны і чытачоў дзіцячай бібліятэкі-філіяла №6 імя Васіля Віткі ДУ “Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска” злучыў тэлемост. Мэтай літаратурнай скайп-сустрэчы стала жаданне сумесна адсвяткаваць 105-ю гадавіну з дня нараджэння Васіля Віткі А ў бібліятэцы прэзентавалася новая кніга В.Віткі “Сонечны чараўнік”, якую нашы чытачы прадставілі

віртуальным госцям. На гэтай нязвыклай прэзентацыі прысутнічаў галоўны рэдактар часопіса “Вясёлка”, пісьменнік Уладзімір Ліпскі, які знаходзіўся ў сталічнай бібліятэцы. Тым не менш, гэта сустрэча са





*У прэзентацыі кнігі В. Віткі “Сонечны чараўнік” прынялі ўдзел пісьменнік У. Ліпскі і юныя чытачы г. Мінска*

знакамітым майстрам слова падарыла дзецям шмат станоўчых эмоцый і дала ім магчымасць прадэманстраваць свае таленты. Юныя случчане і іх аднагодкі з Мінска пагутарылі з пісьменнікам, задалі яму пытанні, прачыталі вершы нашага пісьменніка-земляка.

У імправізаваным кафэ “Літаратурны небасхіл Случчыны”, якое цэлы дзень працавала на пляцоўцы ля Гарадскога палаца культуры, наведвальнікаў чакаў шэраг прыемных сюрпрызаў. На сустрэчу з гасцямі кафэ прыйшлі краязнавец Мікалай Хілько, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Ганна Міклашэвіч. Яны расказалі удзельнікам пра свае любімыя кнігі, чыталі вершы. Кожны з прысутных меў магчымасць падыйсці да мікрафона і прадэкламаваць свае любімыя творы. Такія сустрэчы - выдатная магчымасць для школьнікаў не толькі зацікавіцца



*Паэтка Г.Міклашэвіч і краязнаўца М.Хілько дзеляцца творчымі планамі з наведвальнікамі кніжнага кафэ*

творчасцю слынных беларускіх паэтаў і пісьменнікаў, але і пазнаёміцца з сучаснымі беларускімі творцамі.



*Краязнаўчая выстава на бібліятэчным дворыку прыцягвае ўвагу мінакоў*

Літаратурна-пазнавальная вандроўка “Падарожжа з Васем Вясёлкіным па Беларусі” доўжылася на працягу года і ўдала аздобіла 900-годдзе Слуцка.

Мерапрыемствамі былі ахоплены шасцікласнікі з усіх школ горада. Віртуальнае падарожжа змясціла ў сябе шматлікія мерапрыемствы і акцыі. Слайд-прэзентацыя «Палёт скрозь стагоддзі» пазнаёміла ўсіх прысутных з геаграфічнымі і гістарычнымі мясцінамі нашай краіны. Кніжная экспазіцыя “Гонар і слава роднага краю”, гульня-падарожжа “Урокі роднага слова», літаратурны гасцінец “Я слова запаветнага шукаў”, шэраг конкурсаў дапамаглі дзецям глыбей акунуцца ў багатую на падзеі беларускую зямлю. Для нас віртуальная акцыя “Падарожжа з Васем Вясёлкіным па Беларусі” – дадатковая нагода звярнуць увагу на сваю работу ў накірунку папулярызацыі беларускай літаратуры, краязнаўства, яшчэ адзін падарунак горад



*Слуцкае Евангелле - нацыянальная праваслаўная святыня*



*Выстава-інсталяцыя “Не зводзіліся ўсе вякі на Случчыне паэты”*



*Свята не абыйшлося без Васі Вясёлкіна*



*Дашкалята – сапраўдная аздоба свята*

Хвілінкі-весялінкі “Дзедаў карабец” для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў выліліся ў вясёлае свята дзяцінства. У мерапрыемствах узялі ўдзел супрацоўнікі Установы “Рэдакцыя часопіса “Вясёлка”. Дзіцячы аддзел бібліятэкі агарнуў дзяцей атмасферай цяпла, утульнасці і чараўніцтва. Падчас займальных конкурсаў, гульняў, забаўлянак дзеці атрымалі як новыя пазнанні аб любімым часопісе, так і шмат станоўчых эмоцый.




*У час спектаклю*

Цікавасць у самых юных наведвальнікаў гучных чытанняў “Разгорнем кнігу разам” выклікаў прагляд міні-спектакля "Нос" па творы Віткі ў пастаноўцы бібліятэчнага тэатра кнігі “Бураціна”. Дзеці не толькі глядзелі спектакль, але самі былі задзейнічаны ў імпрэзе ў якасці акцёраў, паэтаў, расказчыкаў. Але перш, чым паспрабавацца на ролю, маленькім артыстам патрэбна было пазнаёміцца з творам, прачытаць яго і нават вывучыць на памяць.

Гучныя чытанні “Разгорнем кнігу разам” прахадзілі не толькі ў бібліятэцы, але і ў дзіцячых садках, школах горада і раёна, на гарадскіх і сельскіх пляцоўках. І важным момантам ў ходзе акцыі была

накіраванасць на чытанне беларускай кнігі. У Чытаннях ўдзельнічаў наш партнёр і сябар – часопіс “Вясёлка”.



*Супрацоўнік часопіса “Вясёлка” Радміла Казлякевіч*

Чытанні яшчэ раз паказалі, што інаватыка ў рабоце з творчасцю Віткі не зводзіцца толькі да выкарыстання камп'ютарных і інтэрнэт-тэхналогій. Глыбіні ўспрымання фактаў біяграфіі і твораў Васіля Віткі, як і любога іншага аўтара, спрыяюць праца са словам, прыёмы творчага чытання, дыялогавыя формы, разнастайныя творчыя конкурсы, якія садзейнічаюць раскрыццю творчага патэнцыялу дзяцей і падлеткаў, развіццю крэатыўнасці і талентаў.

Насычаныя падзеямі і сустрэчамі Віткаўскія чытанні завяршыліся і адначасова далі старт чарговым ідэям, нарадзілі новыя пачуцці, натхнілі на



*Чытаць можна з сябрам…*



*…а можна чытаць з бібліятэкарам*

творчасць.